МАЙСТЭРНЯ НАСТАЎНІКА

**І. Л. Селівёрстава**

# Літаратурнае чытанне
## 4 клас
## *Дыягнастычныя матэрыялы*

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання*

Мінск
«Сэр-Віт»
2024

# Прадмова

Неад'емнай часткай арганізацыі навучання па літаратурным чытанні з'яўляецца праверка ўзроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў вучняў. У сувязі з гэтым настаўнік перыядычна праводзіць тэматычны кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, які ажыццяўляецца пасля вывучэння раздзелаў (тэм) вучэбнага дапаможніка з мэтай абагульнення і сістэматызацыі чытацкіх уяўленняў і ведаў вучняў па вывучанай тэме і дыягностыкі ўзроўню развіцця чытацкіх уменняў вучняў. Тэматычны кантроль можа праводзіцца з дапамогай франтальнага вуснага апытання або ў форме пісьмовага кантролю з выкарыстаннем дыдактычных тэстаў.

Заданні, прапанаваныя ў дапаможніку, прадстаўлены сістэмна, па раздзелах, якія суадносяцца з тэматыкай раздзелаў вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для IV класа. Кожная работа прадстаўлена ў двух варыянтах.

Адрасуецца настаўнікам устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

# Чалавек і прырода

## Варыянт 1

1. Да якога жанру адносіцца твор Рыгора Ігнаценкі «Бабіна лета»?

   а) Апавяданне; в) верш;
   б) казка; г) байка.

2. Што напалохала хлопчыка асеннім досвіткам у творы Івана Грамовіча «Выпаў снег»?

   а) Страшны сон; в) яркае святло дня;
   б) моцны грукат; г) цемра навокал.

3. Прачытай уважліва радкі з верша Віктара Гарадзея «Жнівень». Выпішы пары слоў, якія рыфмуюцца.

   У тумане на балоце
   Пратрубілі журавы.
   Гай стаіць у пазалоце,
   Парыжэлі паплавы.

   ______________________________
   ______________________________
   ______________________________

4. З дапамогай якога сродку мовы складзена загадка: «Хто зімой халоднай блукае злы галодны?»?

   а) Параўнанне; в) супрацьпастаўленне;
   б) апісанне; г) пытанне.

5. Якая асноўная думка твора Ганны Скаржынскай-Савіцкай «Чаму пралескі сінія»?
   а) Быць добрым і спагадлівым да чужой бяды;
   б) беражлівыя адносіны да прыроды;
   в) захапленне першым снегам, пачаткам зімы;
   г) любоў да роднага слова.

## Варыянт 2

1. Да якога жанру адносіцца твор Якуба Коласа «Усход сонца»?
   а) Казка;
   б) верш;
   в) апавяданне;
   г) байка.
2. Хто дапамог галоўнаму персанажу твора Ганны Скаржынскай-Савіцкай «Чаму пралескі сінія»?
   а) Праменьчык;
   б) Жаба;
   в) Вецер;
   г) Хмарка.
3. Складзі і запішы невялікае апавяданне пра восеньскі дзень, які табе найбольш запомніўся.

   ________________________________________

   ________________________________________

   ________________________________________

   ________________________________________

4. З дапамогай якога сродку мовы складзена загадка: «Маленькі шарык пад лаўкай шарыць, збірае крошкі, баіцца кошкі»?
   а) Пытання;
   б) супрацьпастаўлення;
   в) апісання;
   г) параўнання.

# Чалавек, слова і кніга

## Варыянт 1

1. Кастусь Цвірка ў творы «У кнігарні» беларускія словы параўноўвае з:

а) казкай;
б) святам;
в) дыяментам;
г) песняй.

2. Якія гістарычныя асобы згадваюцца ў вершы Леаніда Дайнекі «Любіце мову»?

а) Дзед Талаш і Яраслаў Мудры;
б) доктар Скарына і Вітаўт;
в) дзед Талаш і Радзівіл;
г) доктар Скарына і дзед Талаш.

3. Чаму старэйшыя людзі называюць дарогу словам «гасцінец»?

а) Каля яе знаходзілася гасцініца;
б) дарога была шырокая;
в) па ёй ездзілі госці – купцы;
г) на ёй адорвалі гасцінцамі.

4. Складзі і запішы план казкі Алены Масла «Як з'явіўся апостраф».

5. Аб чым папярэджвае нас казачнік, калі надзяляе Андрэя ў творы «Андрэй за ўсіх мудрэй» на некаторы час халодным сэрцам?

а) Нельга шмат часу праводзіць на сонцы, гэта шкодна для здароўя;
б) за ўсё карыснае, бывае, чалавеку даводзіцца плаціць, ахвяраваць чым-небудзь;
в) калі чалавек становіцца адукаваным, то ён можа пачаць важнічаць;
г) трэба шмат часу праводзіць на свежым паветры, каб не захварэць.

## Варыянт 2

1. Да якога жанру адносіцца твор Уладзіміра Корбана «Пчала і Ружа»?

а) Апавяданне;
б) казка;
в) верш;
г) байка.

2. Хто з жывёльнага свету з'яўляецца прыкладам працавітасці для людзей, па меркаванні аўтара верша «Лёгка нам нічога не даецца»? Адказ абгрунтуй і запішы.

3. Што асуджаецца ў творы Уладзіміра Корбана «Пчала і Ружа»?

а) Гультайства;
б) адважнасць;
в) баязлівасць;
г) самалюбаванне.

в) памяць загінуўшых салдат у гады Вялікай Айчыннай вайны;
г) шчасце народа ў мірны час.

5. Складзі і запішы невялікае апавяданне на тэму «Героі вайны ў памяці народа».

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

## Варыянт 2

1. Чаму школу ў творы Янкі Брыля назвалі зялёнай?

а) Сцены пафарбаваны ў зялёны колер;
б) размешчана ў лесе;
в) там вырошчвалі зеляніну;
г) вучылі зусім малых дзяцей.

2. Што прымусіла Марата з твора Міколы Чарняўскага «Клятва Марата Казея» помсціць ворагу?

а) Нападзенне ворага на родную зямлю;
б) вораг спаліў школу;
в) крыўда, што не мог працягваць вучыцца;
г) вораг спаліў родную вёску.

3. У чым заключаецца няшчасце галоўнага героя ў творы Міколы Янчанкі «Сустрэча з бацькам»?

а) Хлопчык не меў цацак;
б) у яго не было чаго есці;

в) яго бацька загінуў на вайне;
г) бацька не прынёс падарунак.

4. Якой тэме прысвечаны твор Петруся Броўкі «А хіба ёсць, што забываюць?»?

а) Цікавае жыццё ў лесе падчас Вялікай Айчыннай вайны;
б) прырода каля абеліска;
в) шчасце народа ў мірны час;
г) памяць загінуўшых салдат у гады Вялікай Айчыннай вайны.

5. Складзі і запішы невялікае апавяданне на тэму «Дзеці на вайне».